# Лета — будаўнічы семестр



*1963 год. Уральская вобласць. Саўгас «Стэпавы». На здымку: гарніст — студэнт 4-га курса фізфака Лёня Зязюлін іграе збор.*

## ВЫСОКА НЕСЦІ ЗВАННЕ БУДАЎНІКА

(Са Статута ўдарнага будаўнічага студэнцкага атрада Беларусі)

### Асноўныя задачы атрада

Студэнцкі будаўнічы атрад Беларусі створаны па рашэнню ЦК ВЛКСМ і ЦК ЛКСМБ. Атрад з'яўляецца ўдарным. Яго мэта — будаўніцтва жылых дамоў, школ, культурна-бытавых і вытворчых аб'ектаў у саўгасах Заходне-Казахстанскага краю, у саўгасах і калгасах Беларускай ССР.

Сваё жыццё і дзейнасць студэнцкі атрад вымярае прынцыпамі маральнага кодэксу будаўніка камунізма.

Асноўныя задачы атрада: выдатна спраўляцца з вытворчымі заданнямі, змагацца за высокую якасць работ, выхоўваць у членаў атрада камуністычныя адносіны да працы, дружыць з мясцовымі камсамольскімі арганізацыямі, быць іх саюзнікамі ў прапагандысцкай, лекцыйнай, культурна-масавай і спартыўнай рабоце, быць калектыўным сябрам мясцовых школьнікаў.

Спаборніцтвы за камуністычную працу і побыт — абавязак кожнага, хто атрымлівае пуцёўку члена атрада.

### Абавязкі члена атрада

Стаўшы членам атрада, ты абавязан высока несці званне камсамольца, быць прыкладам у працы, узорам у дысцыпліне, інтарэсы справы, інтарэсы калектыву павінны заўсёды быць вышэй за твае асабістыя інтарэсы. Стаўшы членам атрада, ты становішся баявым агітатарам, сябрам дзяцей, застрэльшчыкам у палітычнай, спартыўнай і культурна-масавай рабоце. Ты пастаянна памятаеш, што тваёй дапамогі чакаюць групы садзейнічання партыйна-дзяржаўнаму кантролю, пасты «камсамольскага пражэктара», народныя дружыны.

Ты не толькі па-ўдарнаму працуеш, ты паказваеш прыклад беражлівых адносін да тэхнікі, інструментаў, да ўсіх матэрыяльных каштоўнасцей атрада і саўгаса, не забываешся на правілы тэхнікі бяспекі.

Унутраны распарадак жыцця атрада, рашэнні штаба і распараджэнні яго кіраўнікоў для цябе — закон.

Ты абавязан умець мужна пераадольваць цяжкасці, заўсёды, у любых абставінах быць падцягнутым і ахайным, быць сціплым чалавекам, добрым таварышам.

Ужыванне спіртных напіткаў і гульня ў карты з'яўляюцца найцяжэйшым парушэннем дысцыпліны і цягнуць за сабой неадкладнае выключэнне з атрада. Памятай, што выкананне патрабаванняў статута пачынаецца ў шляху, а таму «сухі закон» уступае ў сілу з моманту пасадкі ў эшалон.

Ведай, што ў камсамола вну моцная даўняя дружба з працаўнікамі цаліны і сельскай гаспадаркі нашай рэспублікі. Зрабі ўсё, каб яна стала яшчэ больш трывалай.

* * *

Няхай кожны працуе так, каб памяць пра будаўнічы атрад увасобілася ў дамы, школы, культурна-бытавыя збудаванні.

Няхай у саўгасах і калгасах Казахстана і Беларусі застанецца добрая слава пра студэнтаў-будаўнікоў.

## Летапіс добрых спраў

У 1963 годзе на цалінных будоўлях працавалі 36 беларускіх студэнцкіх атрадаў, якія налічвалі ў сваім складзе 2655 чалавек. Гэтыя атрады асвоілі 3,7 мільёна рублёў капіталаўкладанняў, пабудаваўшы больш за 360 аб'ектаў, з іх: жылых дамоў (у 1-кватэрным злічэнні) — на 362 кватэры, інтэрнатаў — на 1080 месц, культурна-бытавых аб'ектаў — 34, вытворчых аб'ектаў — 140, іншых аб'ектаў — 6.

Абавязацельства асвоіць 1 тысячу рублёў капіталаўкладанняў у сярэднім на аднаго чалавека фактычна перавыканана на 250 рублёў па капітальнаму будаўніцтву, а ўвогуле па будаўніцтву — на 480 рублёў.

Палітыка-выхаваўчая работа вялася ў такіх кірунках:

а) лекцыйная прапаганда палітычных і навуковых ведаў;

б) культурна-масавая работа;

в) спартыўная работа;

г) работа з дзецьмі;

д) выхаваўчая работа ў атрадзе.

За 2,5 месяца прачытана 282 лекцыі. Па 10 і больш канцэртаў мастацкай самадзейнасці даў кожны атрад, а канцэрты студэнцкай трупы «Вясёлы дэсант» паглядзелі каля 50 тысяч чалавек.

Абсталявана 115 стадыёнаў, валейбольных і баскетбольных пляцовак, спартыўных гарадкоў, пабудаван летні плавацельны басейн. Праведзена 630 спартыўных спаборніцтваў.

Абсталявана 14 школьных фізічных і хімічных кабінетаў. Падаравана цалінным бібліятэкам прыкладна 10 тысяч кніг...

42 студэнты ўзнагароджаны медалем «За асваенне цалінных і абложных земляў».

**(Лічбы і факты ўзяты са справаздачнага даклада камандзіра Беларускага студэнцкага будаўнічага атрада).**

## На рахунак № 70008

Аб'яднаны штаб працы ўніверсітэта абмеркаваў паведамленне сакратара камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна Г. Я. Рылюка аб удзеле камсамольскай арганізацыі ўніверсітэта ў правядзенні масавых мерапрыемстваў, прысвечаных 20-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Рыхтуючы дастойную сустрэчу слаўнай гадавіне і жадаючы прыняць актыўны ўдзел у разгарнуўшымся ў рэспубліцы зборы сродкаў па будаўніцтва помніка героям абароны Брэсцкай крэпасці, штаб працы пастанавіў:

а) разгарнуць работу ў камсамольскіх арганізацыях факультэтаў па збору сродкаў на будаўніцтва помніка героям абароны Брэсцкай крэпасці;

б) падтрымаць ініцыятыву камандзіраў студэнцкіх будаўнічых атрадаў, якія едуць на будоўлі цаліны і Беларусі, — заработак першых двух дзён кожнага члена атрада перадаць у фонд будаўніцтва помніка героям абароны Брэсцкай крэпасці;

в) даручыць камандзірам атрадаў і намеснікам па палітычнай рабоце растлумачыць гэтую пастанову ўсім студэнтам, што ад'язджаюць на будоўлі;

г) даручыць камандзірам атрадаў сабраныя грашовыя сродкі перавесці на банкаўскі рахунак № 70008 і прадставіць у камітэт камсамола адпаведную дакументацыю.

## Мы гатовы ў шлях далёкі

Мы, гісторыкі, члены цаліннага будаўнічага атрада з вялікай нецярплівасцю чакаем ад'езду на цаліну. Мы хочам унесці свой пасільны ўклад ў справу далейшага ўздыму народнай гаспадаркі, будзем змагацца за ажыццяўленне рашэнняў лютаўскага Пленума ЦК КПСС.

Наш атрадны лагер будзе размешчаны на беразе ракі Урал. У палатачным гарадку будуць жыць юнакі. Дзяўчатам саўгас выдзяляе жылое памяшканне. Усім будзе цікава ведаць дакладнае месца нашага будучага лагера. Гэта за 10 кіламетраў ад пасёлка Гарачкінскага, цэнтра саўгаса, за 15 кіламетраў ад раённага цэнтра г. п. Чапаеўска і за 140 кіламетраў ад Уральска.

Саўгас авечкагадоўчы, створаны ўсяго два гады таму назад на базе некалькіх мясцовых калгасаў. Наш атрад будзе ўзводзіць майстэрню, на будаўніцтве якой пакажуць сваё ўменне былыя муляры Федзя Малюта, Жэня Махніс, Эрык Банькоў, Гена Анціпаў, якія не адзін год працавалі на будоўлях. Астатнія члены атрада будуць працаваць на будаўніцтве саманных дамоў.

Праз паўмесяца туды прыедуць нашы першыя пасланцы, кватар'еры, якія разгорнуць падрыхтоўку месца будучага лагера, вырашаць шмат вялікіх і малых пытанняў, звязаных з рознымі бакамі нашага жыцця на цаліне.

Цяпер атрад рыхтуе ў падарунак школьнікам Казахстана бібліятэчку мастацкай літаратуры. Вялікую работу праводзяць студэнты 1-га курса гістарычнага факультэта. У іх збор кніг ідзе поўным ходам. Камсамольцы Кісялёў, Лось, Агееў здалі больш за 20 кніг. Ідзе збор кніг на 2-м і 3-м курсах, а таксама сярод выкладчыкаў гістфака.

Рыхтуе першы выпуск цаліннай насценнай газеты яе рэдактар Лёня Шчыслёнак. Піянерважатыя Зоя Шабан, Валя Кішкурна, Соня Баско шукаюць добрыя кнігі, якія былі б іх сябрамі і памочнікамі ў піянерскай рабоце, каб дзіцячая памяць надоўга захавала ўспаміны пра важатых з Беларусі.

Яшчэ больш клопатаў у камандзіра атрада студэнта 2-га курса гістфака камуніста Івана Стадуба. Наш камандзір выдатна спраўляецца з усімі справамі. Ужо ўкамплектаваны поўнасцю атрад. Усе члены атрада прайшлі медыцынскі агляд. Зараз Стадуб заняты забеспячэннем атрада спецвопраткай, інструментамі. Вялікую дапамогу ён атрымлівае ў камітэце камсамола ўніверсітэта, у раённым і рэспубліканскім цалінных штабах. Работы будзе шмат. Але і на вучобу не забываецца Ваня. Першыя два экзамены — па англійскай мове і па гісторыі КПСС — ён здаў на «выдатна».

Члены нашага будаўнічага атрада выступяць перад рабочымі саўгаса з цікавымі лекцыямі, дадуць некалькі канцэртаў мастацкай самадзейнасці, дапамогуць мясцовым камсамольцам у правядзенні спартыўна-масавай работы.

Хутка праляцяць дні вясновай экзаменацыйнай сесіі, і мы сядзем у поезд, які павязе нас у далёкі Казахстан, што стаў для нас ужо вельмі блізкім.

**Валерый ПРОТЧАНКА,**
**нам. камандзіра па палітычнай рабоце 5-га цаліннага будаўнічага атрада ўніверсітэта.**



*Прыемна далёка ад родных месц атрымаць ліст ад бацькоў, знаёмых, сяброў. З некаторымі пісьмамі хочацца пабыць адзін на адзін. І другакурснік гістфака Коля Кіпрыйчук давярае такія хвіліны толькі аднаму сведку — букету сціплых стэпавых кветак.*

## РЫХТУЙЦЕ КВЕТКІ!

*Сёлета, як і ў мінулым годзе, тры эшалоны беларускіх студэнтаў накіруюцца на будоўлі Уральскай вобласці. Будаўнічыя атрады нашага ўніверсітэта ад'язджаюць з першым эшалонам прыкладна 3—4 ліпеня. Значыцца, да ад'езду засталося ўсяго якіх-небудзь чатыры тыдні. Пасля здачы экзаменаў — у дарогу. Так што, рыхтуйце кветкі, «грамадзяне праваджаючыя»!*

КІНО

## Зямля казахская, пасёлак беларускі

«Вы ведаеце, што такое студэнцкія канікулы? Іх чакаеш цэлы год, а яны прыходзяць раптоўна з апошнім экзаменам», — гэтымі словамі пачынаецца новы дакументальны фільм «Цаліна, вуліца Мінская» рэжысёра У. Шелега па сцэнарыю В. Груша, выпушчаны Мінскай студыяй навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў.

Кінакарціна апавядае пра студэнтаў Беларусі, у прыватнасці, і пра студэнтаў нашага ўніверсітэта, якія мінулым летам па пуцёўках камсамола ездзілі на будоўлі Казахстана. Трэба сказаць, фільм адразу, з першых жа кадраў захоплівае гледача сваёй непасрэднасцю, і чым далей разгортваецца сюжэт, тым больш узнімаецца цікавасць да падзей, што адбываюцца на экране.

Погляд аператара незвычайны і вясёлы, калі ідзе здымка «студэнцкай» цырульні. Ён паэтычны ў начных кадрах, калі адкрывае перад намі бясконцыя прасторы казахскіх стэпаў.

Героі на экране не робяць нічога незвычайнага. Але мы верым, што менавіта ім яно пад сілу, калі перад гледачом адкрываецца панарама Кушумскага гідравузла. Гэта, канешне, не Брацкая ГЭС, але для будучых інжынераў — сур'ёзная праверка характару, волі, здольнасцей.

Усхвалявана гучыць эпізод адкрыцця школы, пабудаванай беларускімі студэнтамі. Яго па праву можна лічыць аператарскай удачай. Стагадовы чабан Дагля Даглай са слязамі на вачах глядзіць на сваіх унукаў і праўнукаў, якія з кветкамі і ўсмешкамі заходзяць у новую школу. Ды і як не з'явіцца слязам, калі гэты чабан у сваім дзяцінстве нават і марыць не мог пра пісьменнасць!

Дыктарскі тэкст гучыць то ў лёгкім размоўным тоне, то павышаецца да публіцыстычных абагульненняў. Добрае гукавое афармленне пераклікаецца з рытмам працы.



*Кадр з фільма «Цаліна, вуліца Мінская».*

Акордам гучыць апошняя сцэна фільма. Студэнты пакідаюць свой будаўнічы фронт, і на месцы былой пустыні ўзнік невялікі пасёлак Віцебскі з адзінай пакуль што вуліцай Мінскай. І гэтыя назвы пасёлка і вуліцы беларускімі імёнамі на казахскай зямлі сімвалізуюць непарушную брацкую дружбу савецкіх народаў.

**Ф. СЯМЁНАЎ,**
студэнт 4 курса вяч. аддз. журналістыкі.

## ТАВАРЫШ!

**Летась камсамольцы Беларусі перадалі школам Уральскай вобласці Казахскай ССР 10 тысяч кніг. Дзве тысячы кніг з іх — падарунак студэнтаў нашага ўніверсітэта. Узімку студэнты і выкладчыкі гістарычнага факультэта паслалі школьнікам саўгаса «Стэпавы» звыш 300 кніг.**

**А сёлета нашы камсамольцы зноў будуць працаваць у Казахстане. Камітэт камсамола і штаб працы ўніверсітэта праводзяць збор кніг для школ Уральшчыны. Кнігі, якія ты прынясеш у камітэт камсамола, нашы студэнты-будаўнікі перададуць школьным бібліятэкам Уральскай вобласці. Памятай: кніга—лепшы падарунак!**

В. а. рэдактара В. ДУБОВІК.

Адрас рэдакцыі:
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 02267. Тыр. 2000. Зак. 2227